Чацвёрты квартал 2025 года адзначыўся мноствам падзей. У гэты перыяд бібліятэкі раёна адзначылі юбілейныя і знамянальныя даты каляндара, праводзіліся мерапрыемствы да Года добраўпарадкавання. Шмат увагі ўдзялялася рабоце па выхаванню здаровага ладу жыцця, праводзіліся мерапрыемствы ў рамках экалагічнага, ідэалагічнага, прававога, сямейнага выхавання.

## Тыдзень бацькоўскай любові

У бібліятэках Шчучынскага раёна у рамках Тыдня бацькоўскай любові прайшлі наступныя мерапрыемствы:

Вечарына "І нашы сны засцерагае маці" (філіял "Тур'янская сельская бібліятэка"); дзень сямейнага адпачынку "Чытаем разам з мамай" (філіял "Васілішкаўская сельская бібліятэка"); праграма "Усё на зямлі ад маміных рук" (філіяле "Ракавіцкая сельская бібліятэка"); святочны вечар "Мілыя, каханыя, родныя" (філіял "Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава"); бібліятэчная вечарына "Восеньскі букет для Мамы" (філіяле "Бакштаўская сельская бібліятэка") Бібліятэкары павіншавалі жанчын, чыталі вершы і спявалі песні, а за кубачкам гарбаты гучалі добрыя пажаданні.

У  для дзяцей рознага ўзросту прайшла . На мерапрыемстве дзеці чыталі вершы пра маму, з натхненнем расказвалі пра сваіх дарагіх матуль, якія яны




прыгожыя, разумныя і добрыя.

У рамках Тыдня бацькоўскай любові ў філіяле "Шчучынская дзіцячая

бібліятэка" прайшло свята "Мама і тата — чароўныя словы". Юныя чытачы разам з мамамі адзначылі гэты асаблівы дзень у бібліятэцы. У атмасферы цяпла і ўтульнасці гучалі шчырыя словы падзякі і віншаванні мамам за іх працу і падтрымку.

У філіяле "Астрынская гарпасялковая бібліятэка" прайшло літаратурнае кафэ "У бацькоў за плячыма крылы анёлаў". Бібліятэкары падрыхтавалі сцэнарый з улікам літаратурных густаў чытачоў, выкарыстаўшы вершы і выказванні пра бацькоў і сям'ю, прымаўкі.

Філіял "Навадворская сельская бібліятэка" правялі літаратурна-музычны мікс "Мая сям'я – тата, мама, я…". Мамы, бабулі і дзеці актыўна ўдзельнічалі ў вясёлых конкурсах і жартоўных віктарынах. На мерапрыемстве гучалі цёплыя віншаванні для маці і тат, ствараючы атмасферу радасці і адзінства.



## Работа з людзьмі пажылога ўзросту

У пачатку кастрычніка традыцыйна адзначаецца свята, прысвечанае самым паважаным і мудрым людзям "залатога ўзросту".

1 кастрычніка ў Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі адбылася цудоўная сустрэча пад назвай "Жыццё ляціць, гартаючы гады". У гэтым святочным мерапрыемстве прынялі ўдзел старшыня Шчучынскага раённага



Савета дэпутатаў, начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Шчучынскага раённага выканаўчага камітэта, кіраўнік Шчучынскай раённай арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў, а таксама паважаныя госці "Залатога ўзросту". У праграме былі займальныя экскурсы ў гісторыю свята і літаратурна-музычнае падарожжа "Как молоды мы были".

У філіяле "Бакштаўская сельская бібліятэка" сабраліся тыя, хто не лічыць свае гады, захоўвае бадзёрасць духу, аптымізм і пачуццё гумару, каб адсвяткаваць Міжнародны дзень пажылых людзей. Удзельнікі мерапрыемства ўдзельнічалі ў вясёлых конкурсах і віктарынах, якія пацвердзілі, што ўзрост трэба ацэньваць не па колькасці пражытых гадоў, а па стане душы.




У філіяле "Ракавіцкая сельская бібліятэка" прайшлі бібліятэчныя вячоркі "Нас старасць дома

не застане". Тут сабраліся людзі старэйшага пакалення, якія жадалі сустрэць гэты дзень весела сярод знаёмых. У мерапрыемстве таксама прыняў удзел айцец Ракавіцкай царквы, які цёпла павіншаваў усіх прысутных.

## Здаровы лад жыцця



5 лістапада ў філіяле "Шчучынская дзіцячая бібліятэка" была арганізавана панарама карысных ведаў пад назвай "Новае пакаленне - за здаровы рух". Хлопцы і дзяўчынкі даведаліся пра сакрэты здаровага ладу жыцця. Яны склалі для сябе меню на дзень, распарадак дня і пагулялі ў рухомыя гульні, таму дзеці падарылі адзін аднаму смайлікі з добрымі пажаданнямі.

29 лістапада ў філіяле "Астрынская гарпасялковая бібліятэка" адбылася сустрэча-дыялог "Вірус, які не ведае межаў", якая была прымеркавана да Сусветнага дня барацьбы са СНІДам. Працуючы з тэмай бібліятэкар выкарыстала інтэрактыўны фармат, уключаючы ў праграму гульнявыя элементы. Ключавой і самай важнай пра гэты дзень стала думка, выказаная ўдзельнікамі: "Мы ведаем пра СНІД вельмі мала...". Гэтая выснова паказвае, як важна працягваць размовы на такія адказныя тэмы.

30 лістапада бібліятэкар філіяла "Ракавіцкая сельская бібліятэка" арганізавала для жыхароў вулічную акцыю "Жыццё цудоўнае – не губі яго". Удзельнікам раздавалі чырвоныя стужкі (сімвал салідарнасці ў барацьбе са

СНІДам) і памятныя буклеты з важнай інфармацыяй пра ВІЧ і СНІД.

2 снежня ў філіяле "Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава" адбылася інфармацыйная сустрэча "Небяспека для жыцця – СНІД". Падчас мерапрыемства ўдзельнікі атрымалі зручную і правільную інфармацыю пра значэнне сімвала чырвонай стужкі, асноўныя адрозненні паміж ВІЧ-інфекцыяй і СНІДам, а таксама пра механізмы перадачы віруса і шляхі яго прадухілення. Фіналам сустрэчы стала прэзентацыя школьнікам тэматычнай кніжнай выстаўкі "Здароўе як мудрасць і мера жыцця".




13 лістапада бібліятэкар філіяла "Ракавіцкая сельская бібліятэка" запрасіла чытачоў на гадзіну здароўя "Выбіраючы жыццё без курэння", прымеркаваная да Міжнароднага дня адмовы ад курэння. Падчас праведзенага мерапрыемства былі закрануты важныя праблемы сучаснага свету: ужыванне тытуню падлеткамі, небяспекі курэння для здароўя, а таксама тое, як курэнне павялічвае рызыку смерці ад захворванняў сэрца і лёгкіх.

16 лістапада ў філіяле "Навадворская сельская бібліятэка" прайшла



гадзіна здароўя "Аргументы супраць курэння". На мерапрыемстве размова ішла аб шкодзе нікатыну, курэння як актыўнага, так і пасіўнага. Падчас гутаркі высветлілі, якую шкоду здароўю чалавека наносіць нікацін, колькі ў свеце пакутуе і гіне людзей ад гэтай згубнай звычкі.

19 лістапада бібліятэкар філіяла "Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава" правяла відэалекторый "Вэйпінг. Што гэта такое і чым небяспечна гэтае захапленне". Увазе хлопцаў і дзяўчынак была прадстаўлена слайд-прэзентацыя "Вэйпінг: небяспечныя памылкі", а таксама відэаролік "Дзеці і вейпы", на якіх наглядна можна ўбачыць, якую небяспеку нясуць не толькі ЭС, але і іншыя псіхаактыўныя рэчывы.

20 лістапада філіял "Жалудокская гарпасялковая бібліятэка" запрасіў навучэнцаў на відэалекторый "Твой выбар: курыць ці жыць" да Сусветнага дня некурэння. Бібліятэкар падкрэсліла важнасць вырашэння праблемы палення. Дзеці пачулі інфармацыю аб шкодзе тытунёвага дыму на чалавечы арганізм, аб наступствах курэння кальяна і электронных цыгарэт. Падлеткі выказвалі свае думкі аб курэнні, аб сваім нежаданні быць пасіўнымі курцамі побач з дарослымі, якія кураць, успомнілі хваробы, якія выклікае курэнне. У канцы сустрэчы прагледзелі відэаролік "Дзевяць пытанняў аб курэнні".

## Святы пажаданняў і надзей



14 снежня ў філіяле "Жалудоцкая горпасялковая бібліятэка" адбылося пасяджэнне аматарскага аб'яднання "Наш край" пад назвай "К живым огням родного очага".

Удзельнікі сабраліся разам, каб паразважаць пра значэнне свята Нараджэння Хрыстова у жыцці кожнага чалавека, а таксама разам успомнілі калядныя традыцыі сваёй мясцовасці, абмяняліся сваімі сямейнымі і кулінарнымі звычаямі, якіх прытрымліваюцца з года ў год у свята Раства.

15 снежня ў філіяле "Шчучынская дзіцячая бібліятэка" адбылося пасяджэнне аматарскага аб'яднання "Свет цудаў" на тэму "Навагоднія традыцыі ў беларускай культуры". Сустрэча была прысвечана знаёмству з традыцыямі святкавання Раства і Новага года ў Беларусі. Таксама ўдзельнікам было прапанавана зрабіць гірлянду па савецкім узоры. Разам дзеці напісалі ліст Дзеду Марозу і папрасілі яго выканаць самыя заветныя жаданні.

26 снежня ў філіяле "Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава" панавала сапраўды чароўная атмасфера. Хлопцы і дзяўчынкі акунуліся ў святочны настрой каля ўпрыгожанай прыгажуні-ёлкі: ламалі галаву над пытаннямі зімовай віктарыны і загадкамі; загадвалі самыя задушэўныя жаданні каля чароўнага ліхтарыка; праявілі спрыт і кемлівасць у вясёлых конкурсах; стварылі ўласнымі рукамі ўнікальныя ёлачныя цацкі на майстар-класе. Эмоцыі білі праз край, смех не сціхаў, і, вядома, ніхто не застаўся без падарунка!




28 снежня ў філіяле "Навадворская сельская бібліятэка" прайшла гадзіна забаў "Па планеце ідзе Новы год". Чытачы даведаліся пра традыцыі і звычаі

святкавання новага года ў розных краінах. Усе дружна ўдзельнічалі ў конкурсах, адгадвалі навагоднія загадкі, а таксама гулялі ў "Навагодні кракадзіл".

28 снежня ў філіяле "Бакштаўская сельская бібліятэка" прайшла забаўляльная гульня "Навагоднія традыцыі". Для ўдзельнікаў мерапрыемства бібліятэкар падрыхтавала цікавую святочную праграму. Праводзіліся вясёлыя конкурсы і віктарыны, удзельнікі спявалі песні і дзяліліся навагоднімі традыцыямі, якія захоўваюцца і перадаюцца з пакалення ў пакаленне ў кожнай сям'і.

## Сусветны Дзень інвалідаў

У бібліятэчных установах Шчучынскага раёна прайшоў шэраг мерапрыемстваў да Міжнароднага дня інвалідаў (3 снежня). Іх галоўнай задачай было прыцягнуць увагу грамадства да праблематыкі жыцця людзей з інваліднасцю і садзейнічаць фарміраванню ветлівага, чулага асяроддзя. У рамках гэтага ў бібліятэках арганізавалі цэлы комплекс мерапрыемстваў: тэматычныя вечарыны, гадзіны дабрыні, кніжныя падборкі і размовы па душы. Уся праца была накіравана на тое, каб стварыць атмасферу ўзаемаразумення і падтрымкі, дапамагчы кожному адчуць, што ён — частка нашай супольнасці.



Бібліятэкары філіяла "Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка" сумесна з супрацоўнікамі філіяла "Жалудоцкі дом культуры" арганізавалі валанцёрскую акцыю "Адкрыйце душу для дабра і чалавечнасці". Яны наведалі актыўных чытачоў з абмежаванымі магчымасцямі, якія знаходзяцца ў Жалудоцкай гарпасялковай бальніцы. У гэты ж дзень у філіяле "Астрынская гарпасялковая

бібліятэка" адбылася сустрэча "Роўныя правы, роўныя магчымасці", таксама прысвечаная гэтай важнай даце.

3 снежня ў філіяле "Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава" адбылося мерапрыемства "Даступны свет для моцных духам". Дзеці даведаліся пра сістэму сацыяльнай падтрымкі, правы і магчымасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў Беларусі, а таксама пазнаёміліся з біяграфіямі вядомых людзей, якія дасягнулі вяршынь, не гледзячы на цяжкасці здароўя.

## Сусветны Дзень правоў дзіцяці

12 лістапада ў філіяле "Шчучынская дзіцячая бібліятэка" прайшло тэматычнае дасье "Ведаць, каб не спатыкнуцца". Дзеці пазнаёміліся са сваімі правамі і абавязкамі, даведаліся пра віды адказнасці за правапарушэнні. У якасці нагляднага прыкладу быў паказаны ролік "Правы дзяцей у Беларусі".



12 лістапада ў філіяле "Каменская інтэграваная бібліятэка" прайшла прававая гутарка на тэму "Як добра мы ведаем правы дзіцяці". Удзельнікі абмеркавалі важнасць ведаў аб правах дзяцей, азнаёміліся з асноўнымі прынцыпамі абароны правоў і абавязкаў. Гутарка садзейнічала развіццю ў дзяцей адказнасці і разумення іх прававой пазіцыі ў грамадстве.

19 лістапада філіял "Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка" правёў інфарм-дайджэст "Мы ў адказе за свае ўчынкі". Бібліятэкар пазнаёміла з асноўнымі дакументамі аб правах і абароне дзяцей, у даступнай форме расказала аб законе "Аб правах дзіцяці" і прапанавала прагуляцца па старонках дзіцячых казак.

20 лістапада ў філіяле "Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава" прайшла прававая гульня "Дзіўнае падарожжа ў Праваградзе". У ходзе гульні хлопцы і дзяўчынкі змаглі разабрацца ў прававых пытаннях і знайсці правільнае выйсце са складаных сітуацый. Яны таксама прынялі ўдзел у казачнай віктарыне, дзе прыгадалі казкі, у якіх былі парушаныя правы герояў на асабістую недатыкальнасць, жыццё і свабоду.

20 лістапада філіял "Тур'янская сельская бібліятэка" запрасіла выхаванцаў ДУА "Дзіцячы сад аграгарадка Тур'я" на прававы калейдаскоп "Вялікія правы – маленькім дзецям". Бібліятэкар пазнаёміла з Канвенцыяй аб правах дзіцяці, адзначыла, што ў дзяцей як і ў дарослых, ёсць свае правы і абавязкі.



20 лістапада ў філіяле "Бакштаўская сельская бібліятэка" мінула гадзіна прававых ведаў "Маю права". Бібліятэкар пазнаёміла хлопчыкаў і дзяўчынак з асноўнымі дакументамі, у якіх замацаваны правы дзяцей: "Канвенцыяй аб правах дзіцяці", законе Рэспублікі Беларусь "Аб правах дзіцяці". Дзеці разабраліся, якія правы і абавязкі замацаваны ў гэтых дакументах, разгледзелі атрыманыя звесткі на прыкладах жыццёвых сітуацый.

20 лістапада бібліятэкар філіяла "Ракавіцкая сельская бібліятэка" правяла займальнае падарожжа ў прававую краіну "Па лабірынтах права". Юныя чытачы пазнаёміліся з правамі і абавязкамі дзіцяці. Ім было прапанавана заданне, дзе яны самі змаглі размеркаваць, што адносіцца

да правоў, а што да абавязкаў. Таксама яны паўдзельнічалі ў гульні "Парушэнне правоў у казках".

24 лістапада у філіяле "Навадворская сельская бібліятэка" прайшла эрудыт-гадзіна "Я, ты, мы – прававое грамадства". Юныя чытачы даведаліся пра значэнне паняццяў "грамадзянін", "правілы", "законы" і "правы і абавязкі дзіцяці". Для замацавання ведаў аб правах і абавязках хлопцы і дзяўчынкі ў гульнявой форме пабудавалі дамы з назвамі "Правы" і "Абавязкі".

## Літаратурныя юбілеі

5 кастрычніка ў філіяле "Тур'янская сельская бібліятэка" прайшла паэтычная гадзіна "Я сердцем никогда не лгу..." у гонар 130-годдзя з дня нараджэння С. А. Ясеніна. Бібліятэкар прадставіла электронную прэзентацыю "Жыццё і творчасць Сяргея Ясеніна", азнаёміўшы ўдзельнікаў з асноўнымі момантамі біяграфіі і творчасцю вялікага рускага паэта. Удзельнікі чыталі любімыя вершы і дзяліліся ўражаннямі, а бібліятэкар пазнаёміла іх з выданнямі С. Ясеніна, якія ёсць у бібліятэцы.

У Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі прайшло пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні "Ад усёй душы" на тэму "На хвалях Нёмана", прысвечанае 80-годдзю часопіса. Удзельнікі з цікавасцю даследавалі старонкі найстарэйшага літаратурна-мастацкага часопіса Беларусі, заснаванага ў 1945 годзе. Усе пагадзіліся, што сярод таленавітых аўтараў кожны знойдзе любімага пісьменніка.

30 кастрычніка філіял "Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка" запрасіў навучэнцаў на вечарыну-партрэт "Сцежкамі беларускага пісьменніка", прысвечаны 95-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча. У займальнай форме прайшло знаёмства хлопцаў і дзяўчынак з літаратурнай спадчынай пісьменніка "Быў. Ёсць. Буду!" Увазе школьнікаў быў прапанаваны пазнавальны конкурс "Збяры назву твора", у якім кожны мог паказаць свае веды. Займальным аказалася віртуальнае падарожжа па месцах, якія ўвекавечылі памяць аб каханым пісьменніку.



8 лістапада філіял "Васілішкаўская сельская бібліятэка" запрасіў дзяцей з аздараўленчага лагера "Бусляняты" на гадзіну развагі "Лёс краіны ў лёсе чалавека", прымеркаваны да 95-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча. Удзельнікі мерапрыемства разам з бібліятэкарам абмеркавалі творчасць пісьменніка. Дзеці пазнаёміліся з казкамі "Верабей, сава і птушыны суд" і "Жабкі і Чарапаха", якія былі напісаны на аснове беларускіх народных казак. Дзеці з задавальненнем разглядалі ілюстрацыі знаёмых казак, малявалі казачных герояў, інсцэніравалі казкі і пераўвасабляліся ў казачных персанажаў.

21 лістапада Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі запрасіла аматараў літаратуры на чарговае пасяджэнне







гасцінай "Ад усёй душы" на тэму "Пятніца з Уладзімірам Караткевічам", каб разам адзначыць 95 год з дня яго нараджэння. Караткевіч - таленавіты аўтар, які змог узняцца над сваім часам. Таму і ўдзельнікі з задавальненнем прайшліся яго літаратурнымі сцежкамі: наведалі яго асабісты пост, паспрабавалі свае сілы ў стварэнні падкастаў ад Уладзіміра Караткевіча.

26 лістапада ў філіяле "Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава" для юных чытачоў адбылося літаратурнае знаёмства "Палёт на белых крылях", прымеркаванае да 95-годдзя класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча. У ходзе мерапрыемства прысутныя пазнаёміліся з біяграфіяй пісьменніка і яго разнастайнай творчасцю, прасякнутай любоўю да роднай Беларусі.

## Фарміраванне інфармацыйнай культуры

Урокі інфармацыйнай культуры ў бібліятэчных установах – работа, якая ставіць сваёй мэтай выхаванне інфармацыйнай культуры сярод навучэнцаў, фарміраванне навыкаў працы з інфармацыяй і дапамогу ва ўжыванні гэтых уменняў на практыцы.

23 кастрычніка бібліятэкары філіяла "Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка" правялі выязны дзень інфармацыі "Мелодыі роднага краю" ў філіяле "Жалудоцкі дом культуры" і ДУА "Жалудоцкая дзіцячая



школа мастацтваў". На сустрэчы былі прадстаўлены навінкі краязнаўчай літаратуры, у тым ліку сацыяльна значныя выданні. Удзельнікі адзначылі важнасць такіх мерапрыемстваў для папулярызацыі мясцовай культуры і гісторыі.

12 лістапада філіял "Ракавіцкая сельская бібліятэка" чарговы раз правёў выязны дзень інфармацыі на прадпрыемства ААТ "Орля". Па заяўках работнікаў былі прадстаўлены розныя перыядычныя выданні, цікавыя кнігі, а таксама новая літаратура, у тым ліку сацыяльна значныя выданні. Работнікі актыўна абменьваліся прачытанымі кнігамі і часопісамі на новыя.

18 лістапада філіял "Васілішкаўская сельская бібліятэка" правёў выязны дзень інфармацыі "Знаёмімся з новай сацыяльна значнай літаратурай" для работнікаў Васілішкаўскага сельскага выканаўчага камітэта. Бібліятэкар правяла бібліяграфічны агляд новых паступленняў у сельскую бібліятэку і актуальных выданняў сацыяльна значнай літаратуры.

25 лістапада адбыўся выязны дзень інфармацыі на прадпрыемстве Шчучынскага філіяла ААТ "Молочный Мир", арганізаваны супрацоўнікамі аддзела абслугоўвання і інфармацыі Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі. Гэта мерапрыемства стала выдатнай магчымасцю для работнікаў прадпрыемства не толькі даведацца аб навінках літаратуры, але і актыўна абмяняць прачытаныя кнігі і  часопісы на новыя выданні.

## Павышэнне прафесійнага майстэрства




24 кастрычніка для супрацоўнікаў ДУК "Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі" прайшла школа вучобы, прысвечаная тэме "Работа бібліятэк па прававой асвеце насельніцтва". У ходзе мерапрыемства былі разгледжаны ключавыя пытанні, у тым ліку роля бібліятэк у распаўсюджванні прававых ведаў, абмеркаванне важнасці бібліятэк, у павышэнні прававой пісьменнасці насельніцтва. Карыстанне інфармацыйнымі прававымі рэсурсамі: агляд даступных рэсурсаў і метадаў іх выкарыстання. Агляд сацыяльнай літаратуры прававой тэматыкі: азнаямленне з актуальнымі выданнямі па прававых пытаннях. Практыка папулярызацыі кніг: абмен досведам паспяховых мерапрыемстваў па прасоўванні прававой літаратуры ў бібліятэчных установах Гродзенскай вобласці.



Школа вучобы стала важным крокам у павышэнні прафесійных навыкаў супрацоўнікаў і пашырэнні іх магчымасцяў у галіне прававой асветы.

21 лістапада для супрацоўнікаў ДУК "Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі" прайшла школа вучобы, прысвечаная важнай і актуальнай тэме: «Планаванне дзейнасці бібліятэк раёна на 2026 год». Мерапрыемства мела мэту выпрацаваць адзіны вектар развіцця, сістэматызаваць працэсы і вызначыць прынцыповыя напрамкі працы на наступны год. Школа вучобы прайшла ў фармаце прадуктыўнага дыялогу, дзе супрацоўнікі маглі не толькі атрымаць неабходныя метадычныя рэкамендацыі, але і абмеркаваць уласныя прапановы, перадаць вопыт. Такія сустрэчы з’яўляюцца важным крокам для каардынацыі намаганняў усіх філіялаў, забеспячэння якаснага планавання і павышэння прафесійнай майстэрства калектыву.

Бібліятэкар аддзела маркетынгу,
сацыякультурнай дзейнасці і
метадычнай работы А.С. Бочка